Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

Вас. Лебедев-Кумач.

Боевая конная

Запоем, друзья, о Первой Конной,
Чтоб на-славу песня удалась,
Чтоб во все полки и эскадроны
Легкой птицей песня донеслась.

Славься силой молодецкой,
В битвах закаленная,
Гордость Родины советской—
Боевая конная!

Знойным летом и зимой
студеной,
Под жестоким вражеским
свинцом
Собирал ряды твои Буденный,
Ворошилов был твоим отцом.

Октябрил тебя товарищ Сталин
И бойцам по-сталински сказал,
Чтобы люди были крепче стали,
Чтобы конь, как молния летал!

И сбылося сталинское слово,
Как оно сбывается всегда,—
Разбивала конница любого,
Не давала скрыться никуда.

Сосчитай-ка битых-перебитых
Всех врагов за двадцать
славных лет,—
Сто имен баронов и бандитов,
Сто вагонов пышных эполет!

Нам знамена радостно и гордо
Свой рассказ поведают простой
О боях дивизии четвертой,
О делах дивизии шестой.

Нам напомнят стены Сталинграда
Про геройских Родины сынов,
Нам расскажут Дубно и Отрада,
Как рубили белых и панов.

Слава павшим конникам-героям,
Честь и слава доблестным
живым!
Имена их будут перед боем
Зажигать нас пылом боевым.

Запоем, друзья, о первой Конной,
Чтоб на-славу песня удалась,
Чтоб во все полки и эскадроны
Легкой птицей песня донеслась.

Славься силой молодецкой,
В битвах закаленная,
Гордость Родины советской—
Боевая Конная!

РАБОТНІЦА І КАЛГАСНІЦА БЕЛАРУСІ. ВЫДАННЕ ЦК КП(б)Б № 22. ЛІСТАПАД 1939 г.

Маральна-палітычнае адзінства народа

З грамадным уздымам народы нашай ордэнаноснай рэспублікі рыхтуюцца да дня выбараў у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных. Цяжка знайсці чалавека, які-б не імкнуўся, як след, адзначыць гэтую знамянальную дату. Аб гэтым ярчэй за ўсё сведчыць велізарны палітычны ўздым актыўнасці мас, які адбываецца ва ўсёй краіне.

Як і ў часе папярэдніх выбараў у Вярхоўны Совет СССР, Вярхоўныя Советы Саюзных рэспублік, партыя большэвікоў выступае і на выбарах у абласныя, раённыя, гарадскія, сельскія пасялковыя Советы дэпутатаў працоўных у цесным блоку з беспартыйнымі. На многалюдных сходах рабочых, служачых, калгаснікаў, воінскіх часцей вылучаны ўжо кандыдаты ў дэпутаты мясцовых Советаў. Як горача і дэталёва абгаварваецца кожная выстаўленая кандыдатура!

Толькі лепшым сваім прадстаўнікам народ аказвае давер'е. Хто гэтыя людзі, якія ўдастойваюцца вялікага гонару балатыравацца ў Советы? Знатныя стаханаўцы, стаханаўкі фабрык, заводаў і соцыялістычных палёў, лепшыя прадстаўнікі інтэлігенцыі, кіраўнікі партыйных і совецкіх арганізацый, доблесныя сыны Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі. Тыя, якія на справе паказалі ўменне змагацца за росквіт нашай радзімы, якія неўстрашымы ў барацьбе з ворагамі.

Сярод народных вылучэнцаў вялікая колькасць жанчын. Яшчэ і яшчэ раз увесь свет можа наглядна ўпэўніцца, што жанчыне ў СССР прадастаўляюцца роўныя правы з мужчынай выбіраць і быць выбранымі ў дзяржаўныя органы ўлады.

На фабрыках «Комунарка», імені Крупскай і другіх прадпрыемствах горада Мінска вылучылі кандыдатам у дэпутаты абласнога Совета Марыю Раманаўну Іваноўскую. Біяграфія яе нескладаная, але цікавая. З сямі год яе аддаюць у нянькі да папа. Бязрадасна праходзіць дзяцінства і юнацтва. І толькі на совецкай фабрыцы разгортваюцца здольнасці тав. Іваноўскай. З малапісьменнай работніцы яна, вучачыся і працуючы, вырастае ў майстра, у грамадскага дзеяча.

Работнікі мастацтва вылучылі кандыдатам у дэпутаты Мінскага абласнога Совета народную артыстку рэспублікі Ларысу Пампееўну Александроўскую. Няма сумнення, што вялікае званне дзяржаўнага дзеяча тав. Александроўская апраўдае з гонарам, бо яна добра ведае, што толькі Совецкая ўлада стварыла ўсе магчымасці для творчай і яркай работы, для развіцця яе таленту.

Кандыдатам у дэпутаты Віцебскага абласнога Совета вылучана начальнік міжгародняй тэлефоннай станцыі Іда Альбертаўна Бузган. Яна яшчэ зусім маладая, але дзякуючы совецкай уладзе атрымала магчымасць скончыць інстытут і стаць совецкім спецыялістам. У Крычаўскі раённы Совет вылучана тав. Гіндзіна. Увесь раён ведае яе, як лепшую трактарыстку-ільноцерабільшчыцу. За 1939 г. тав. Гіндзіна выцерабіла 100 гектараў ільна, замест 50 па норме.

Агітатарам і ўсяму актыву, прымаючым удзел у прадвыбарчай кампаніі, выпала ганаровая работа—расказаць аб жыцці і дзейнасці кандыдатаў у дэпутаты. На іх біяграфіях ярчэй за ўсё можна паказаць, як хутка растуць людзі ў краіне соцыялізма.

Перадвыбарчая кампанія выклікала новы магутны ўздым соцыялістычнага спаборніцтва. У сувязі з выбарамі многія рабочыя калектывы БССР абавязаліся датэрмінова закончыць гадавыя планы. Прадзільная фабрыка Аршанскага ільнокамбіната павялічыла выпуск прадукцыі на 15 процантаў. Стаханаўкі гэтага камбіната тт. Медзведзева, Глушакова і іншыя перайшлі на абслугоўванне васьмі станкоў. Рабочыя і служачыя Гомельскай трыкатажнай фабрыкі абавязаліся да 12 снежня выканаць гадавы план. Гэта абавязацельства з гонарам выконваецца. На 16 лістапада фабрыка выканала адзінаццацімесячную праграму.

Вялікі творчы ўздым назіраецца і сярод хатніх гаспадынь. Так актывісткі Гомельскага кандуктарскага рэзерва зрабілі вельмі многа па падрыхтоўцы да зімы. Іх прыкладу следуюць многія жанчыны.

Да выбараў засталіся лічаныя дні. Неабходна каб нашы актывісткі, стаханаўкі прадпрыемстваў і калгасаў, інтэлігенткі і хатнія гаспадыні сапраўды па-большэвіцку падрыхтаваліся да іх, каб яшчэ ярчэй загучэлі свяшчэнныя словы большэвіцкай агітацыі.

У нас ёсць аб чым расказаць кожнаму выбаршчыку, кожнай выбаршчыцы. Пад кіраўніцтвам Комуністычнай партыі і яе мудрага правадыра таварыша Сталіна БССР ператварылася ў квітнеючую індустрыяльна-калгасную рэспубліку. Кожная фабрыка, кожны завод, кожны горад, пасёлак і калгас, кожная навучальная ўстанова з'яўляецца ярчайшым аб'ектам для агітацыі.

Вялікія дасягненні краіны соцыялізма адчуваем мы, жанчыны ў першую чаргу. Мы, як і ўсе грамадзяне Совецкага Саюза, атрымаўшыя па Сталінскай Канстытуцыі права на працу, асвету, адпачынак, забяспечаную старасць, мы, чые дзеці вучацца ў прыгожых школах, выхоўваюцца ў выдатных дзіцячых садах і яслях.

Жанчыны Совецкай Беларусі на выбарах у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных яшчэ раз пакажуць сваё адзінадушша, пакажуць сваю неразрыўную сувязь з партыяй Леніна—Сталіна і яшчэ больш умацуюць маральна-палітычнае адзінства нашага народа.

24 снежня 1939 года, будзем галасаваць за верных адданых сыноў і дачок нашай цудоўнай радзімы.

Усе, як адзін, аддадзім свае галасы кандыдатам Сталінскага блока комуністаў і беспартыйных.

Да пяцігоддзя з дня владзейскага забойства С. М. Кірава

Трыбун партыі

Сергей Міронавіч Кіраў, верны вучань і саратнік вялікага Сталіна, быў любімцам не толькі ленінградскіх большэвікоў, але ўсёй партыі, усёй Совецкай краіны.

З трыбуны ўсіх партыйных з'ездаў грымеў голас Кірава, бязлітасна граміўшага трацкісцка-бухарынскіх здраднікаў. Яго магутны аратарскі талант служыў справе партыі, справе рабочага класа.

На адной з ленінградскіх партыйных канферэнцый ён гаварыў:

«Прыклад Хібін асабліва паказальны з пункту гледжання далейшага ўздыму вытворчых сіл нашай краіны.

Гэта нагляднейшы доказ таго, што ў выніку звяржэння капіталістычнай сістэмы ствараецца нябачаны размах разгортвання вытворчых сіл. Мы ў другой пяцігодцы пакажам, што няма такога месца на зямлі, якое нельга было-б паставіць на службу соцыялізму».

Гэту вялікую і простую ісціну Сергей Міронавіч даказаў усім сваім жыццём і дзейнасцю.

Кіраў быў членам Палітбюро і сакратаром Цэнтральнага Камітэта нашай партыі, членам Прэзідыума ЦВК СССР. Ён прымаў самы актыўны ўдзел ва ўсёй дзяржаўнай рабоце. Асаблівую ўвагу ён удзяляў пытанням навукі, мастацтва, культуры.

Сергей Міронавіч, не гледзячы на занятасць, многа чытаў, добра ведаў класічную і сучасную літаратуру. Ён сачыў за ўсімі навінамі літаратуры, мастацтва, ведаў усе апошнія дасягненні навукі і тэхнікі, любіў тэатр, музыку і ўважліва сачыў за ростам і развіццём усіх відаў мастацтва ў Ленінградзе.

Велізарнае значэнне Кіраў надаваў рэволюцыйнай тэорыі, большэвіцкаму, ленінскаму выхаванню партыйцаў. Ён часта папярэджваў партыйныя арганізацыі, што кожны новы дзень будзе ставіць перад імі новыя і больш складаныя задачы. Каб правільна іх вырашыць, большэвікі павінны яшчэ глыбей вывучаць рэволюцыйную тэорыю, яшчэ лепш авалодаць ёю. Сергей Міронавіч неаднаразова паўтараў, што **«самае каштоўнае, самае дарагое, самае блізкае для ўсякага большэвіка—гэта ленінскае выхаванне членаў нашай партыі».**

На здымку: С. М. Кіраў вітае V абласную і II гарадскую Ленінградскую партыйную канферэнцыю (1934 год).
Фота Э. Хайкіна (Фотаклішэ ТАСС).

«Гісторыя большэвізма,—гаварыў Кіраў у сваім дакладзе, у студзені 1932 года на IV Ленінградскай аб'яднанай абласной і гарадской канферэнцыі ВКП(б),—баявая зброя міжнароднага пралетарыята ў барацьбе за комунізм, непераможная зброя рабочага класа СССР у будаўніцтве соцыялізма. Гісторыя нашай партыі вучыць таму, як вызваляць працоўных ад гнёта капітала, як заваяваць дыктатуру рабочага класа.

Гісторыя нашай комуністычнай партыі ёсць гісторыя пабеданоснай пролетарскай рэволюцыі і будаўніцтва соцыялізма. Кожны шаг, кожная старонка, кожны радок гісторыі нашай партыі—гэта не проста хроніка падзей, гэта велізарная глыбокая навука, не ведаючы якой нельга рабіць пролетарскую рэволюцыю».

Разам з таварышамі Сталіным і Жданавым Сергей Міронавіч удзельнічаў у напісанні заўваг на канспект падручнікаў па гісторыі СССР і новай гісторыі. Гэтыя заўвагі сталі адпраўнымі вехамі ў вывучэнні гісторыі нашай краіны, гісторыі СССР і новай гісторыі.

С. М. Кіраў быў членам Галоўнай рэдакцыі «Гісторыі грамадзянскай вайны ў СССР». Многа ўвагі ён удзяляў навукова-даследчым інстытутам, вышэйшым навучальным установам Ленінграда.

Кіраў любіў доблесных абаронцаў нашай соцыялістычнай радзімы—Чырвоную Армію і Чырвоны Флот і клапаціўся аб іх. Ён бываў часта ў чырвонаармейскіх інтэрнатах, на караблях Балтыйскага флота. Разам з народным камісарам абароны СССР таварышам Варашылавым ён амаль кожны год удзельнічаў у манеўрах Балтыйскага флота.

У 1934 годзе Сергей Міронавіч ездзіў у Казахстан. Казахстан не спраўляўся з хлебапастаўкамі. Цэнтральны Камітэт партыі паслаў туды таварыша Кірава.

Каля месяца прабыў Кіраў у Казахстане. Ён хутка падняў на ногі партыйную арганізацыю і совецкі апарат на выкананне важнейшых заданняў партыі і ўрада. Кіраў наведаў дзесяткі калгасаў, МТС, аб'ездзіў многа раёнаў. Пад яго кіраўніцтвам Казахстан выканаў свае абавязацельствы перад совецкай дзяржавай.

Кіраў умеў працаваць, але ўмеў і адпачываць. Здаровы, вясёлы, бадзёры, ён любіў прыроду. У свабодныя мінуты ён стараўся выбрацца за горад. З ружжом і сабакай ён брадзіў па аколіцах Ленінграда. Лясныя зараслі, балотная багна не спынялі яго. Ён быў выносліві і прайсці пехатой некалькі дзесяткаў кіламетраў для яго не прадстаўляла асаблівай цяжкасці. Ён быў сапраўдным паляўнічым, з ім цяжка было саперніча ць у стральбе. Страляў ён метка, без промаху. Гэты жывы, дзеяцельнейшы чалавек, выдатны ўзор большэвіка сталінскай эпохі, страсна любіў жыццё.

Бліжэйшыя сябры і саратнікі Сергея Міронавіча любілі яго, клапаціліся аб ім.

Серго Орджанікідзе пісаў яму з Кіславодска летам 1928 года:

«Як прайшло тваё паляванне? Многа там перабіў усялякай дзічыны?

Ты, брат, усё-такі па-чалавечы адпачні, а то таксама што-небудзь выскачыць, а потым будзе позна.

Адпачні, дзеля ўсяго, па-чалавечы адпачні.

Я сябе адчуваю ніштo, хоць почкі баляць амаль увесь час. Хутка вярнуся ў Маскву, і там рашым, як быць далей. Справы з почкамі вельмі няважныя, але тут нічога не зробіш. Маруся раскажа падрабязна. Мне чартоўскі хочацца пабалтаць з табой па вельмі многіх пытаннях, але ў пісьме ўсяго не скажаш, лепш адкладзем да сустрэчы!

Ну, будзь здароў.

Адпачні абавязкова.

Моцна, моцна абнімаю цябе. Твой Серго».

Кіраў любіў многакрасачнае жыццё нашай краіны. Ён яго сам будаваў і чакаў ад яго ўперадзе так многа для сваёй радзімы, для працоўных роднай яму краіны.

«... мы тут, на шостай частцы зямной сушы, бачым,—гаварыў Кіраў на пленуме Ленінградскага абласнога камітэта партыі ў ліпені 1934 года,— як з дня на дзень, з гадзіны ў гадзіну куецца новае, соцыялістычнае грамадства, будуецца сапраўды магутнае жыццё працоўных, і трэба быць сляпым, каб не бачыць, як цяпер увесь зямны шар раскалоўся на два гіганцкіх, але не роўных паўшар'і: на адным ноч, цемра і запусценне і мёртвае слова—смерць, на другім—жыццё, работа і творчасць і пераможнае слова—уперад да новага жыцця. І таварышы, няма людзей шчаслівей тых, якія называюцца большэвікамі. На гэтым паўшар'і мы з вамі нясем уперад гэты пераможны сцяг, і мы безумоўна пераможам, калі будзем верны заветам Леніна, калі будзем следваць указанням нашага любімага Сталіна».

З трыбуны XVII з'езда ў апошні год свайго жыцця ён гаварыў:

«Поспехі сапраўды ў нас велізарны. Чорт яго ведае, калі па-чалавечы сказаць, так хочацца жыць і жыць. На самой справе, паглядзіце, што робіцца...»

Кіраву не ўдалося дажыць да нашых дзён. Подлая рука фашысцкага бандыта абарвала яго яркае і прыгожае жыццё.



Карціна мастака Д. А. Налбандзян: „І. В. Сталін, К. Е. Варашылаў і С. М. Кіраў на Беламорска-Балтыйскім канале"
Фота Г. Шырокава (Фотахроніка ТАСС).

НЯХАЙ ЖЫВЕ БЛОК КОМУНІСТАЎ І БЕСПАРТЫЙНЫХ

Кандыдат у дэпутаты Магілёўскага абласнога Совета дэпутатаў працоўных, начальнік ОТК Магілеўскай шоўкавай фабрыкі імені Куйбышэва, ордэнаносец Галіна Грыгор'еўна Собалева.
Фота А. Розельмана (Фотахроніка БЕЛТА).



Кандыдат у дэпутаты Гомельскага абласнога Совета дэпутатаў працоўных, майстар дрэваапрацоўчага цэха Нова-Беліцкага лесакамбіната, член партыі Пелагея Іванаўна Гузоўская.
Фота А. Шаевіча (Фотахроніка БЕЛТА).

Бонларава Надзежда Пятроўна, памочнік майстра ленты 2 пашывачнага цэха швейнай фабрыкі „Кастрычнік" (Мінск) вылучаная кандыдатам у дэпутаты Мінскага абласнога Совета дэпутатаў працоўных.
Фота І. Шышко (Фотахроніка БЕЛТА).

ВЫЛУЧЭНКІ НАРОДА

Дзённая змена швейнай фабрыкі імені Крупскай скончыла сваю работу. Работніцы, хутка пераапрануўшыся, спяшаюцца на перадвыбарчы сход. Ва ўсіх узняты, вясёлы настрой.

Па-святочнаму ўпрыгожана памяшканне фабрычнага клуба. На сценах партрэты правадыроў, лозунгі і плакаты. Тут сабралася каля 500 рабочых і работніц фабрыкі.

Перадвыбарчы сход адкрывае старшыня фабрычнага камітэта Варвара Алексееўна Шэрко. Яна прадастаўляе слова сакратару партыйнага камітэта тав. Зарэцкай.

— Выбары ў мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных на аснове Сталінскай Канстытуцыі,—гаворыць тав. Зарэцкая,—яшчэ раз пакажуць усяму свету сілу і магутнасць непераможнага Сталінскага блока комуністаў і беспартыйных, яшчэ лепш умацуюць маральна - палітычнае адзінства совецкага народа. Я прапаную вылучыць кандыдатам у дэпутаты Мінскага абласнога Совета лепшую стаханаўку шакаладнага цэха канфетнай фабрыкі «Комунарка» Марыю Раманаўну Іваноўскую.

Наступнай бярэ слова работніца фабрыкі Аня Парашчэнка.

— На выбарах у мясцовыя органы совецкай улады,—гаворыць яна,—як і на выбарах у Вярхоўныя Советы Саюза ССР і саюзных рэспублік Комуністычная партыя выступае ў блоку з беспартыйнымі масамі. І толькі дзякуючы гэтаму блоку мы жывем, вучымся, радуемся пад сонцам Сталінскай Канстытуцыі.

Я падтрымліваю кандыдатуру тав. Іваноўскай аб вылучэнні яе кандыдатам у дэпутаты абласнога Совета. Яна ўсім нам вядомая старая работніца фабрыкі і наша давер'е апраўдае з гонарам.

Адна за другой выступалі работніцы. Усе яны падтрымлівалі кандыдатуру тав. Іваноўскай.

Агульны сход рабочых і работніц фабрыкі імені Крупскай аднагалосна пастанавіў вылучыць кандыдатам у дэпутаты Мінскага абласнога Совета дэпутатаў працоўных па 10 Прамысловай выбарчай акрузе Марыю Раманаўну Іваноўскую.

Тав. Іваноўская нарадзілася ў сям'і батрака вёскі Курманава Мсціслаўскага раёна. Бацька і маці працавалі ўвесь час у памешчыцкім маёнтку. Жылі бедна. Марылька рана пазнала гора і нужду. Як толькі паднялася на ногі, бацькі аддалі яе служыць за няньку к папу. Няньчыла яна дзяцей, паліла печку, варыла абед. Марылька была маленькай і па росту. Калі трэба было пакласці дровы ў печ, яна заўсёды станавілася на крэсла. Ездзіла яна з папом збіраць «каляду». Кожны раз, калі ад'язджалі, пападдзя давала ёй наказ: «Глядзі, дзеўка, калі сяляне будуць даваць бульбу, то з рук не бяры, а сама лезь у склеп і выбірай лепшую».— Пападдзя была злоснай. Трэба было абавязкова выконваць яе наказ.

Аднойчы паехала Марылька з папом абворваць бульбу. Неўзабаве прывезлі хрысціць дзіця. Поп хутка накіраваўся да-хаты, а дзяўчынцы загадаў вартаваць каня. Раптам здарылася няшчасце—не стала сахі і невядома хто забраў. Вось тут і быў наганяй ёй ад папа. Марылька не магла больш цярпець папоўскіх здзекаў, забрала сваю шэрую світку і перайшла служыць хатняй работніцай да другога

НА ВЫБАРАХ У СОВЕТЫ ДЭПУТАТАЎ ПРАЦОЎНЫХ

гаспадара. Праслужыла там пяць год...

Толькі Совецкая Ўлада назаўсёды знішчыла паднявольную працу і эксплаатацыю чалавека чалавекам. І тав. Іваноўская пайшла працаваць на канфетную фабрыку. Спачатку яна працавала чорнарабочай, пасля два гады—брыгадзірам завёртачнай машыны карамельнага цэха. Зараз з'яўляецца зменным майстрам. Яе змена на фабрыцы лічыцца перадавой. Тав. Іваноўская паступова на вытворчасці расла і вылучалася.

Шлях тав. Іваноўскай—гэта шлях многіх радавых совецкіх жанчын. Яна выросла з чорнарабочай у кіраўніка буйнага цэха. Адзінаццаты год працуе на канфетнай фабрыцы. Адна з лепшых работніц фабрыкі, адна з лепшых стаханавак. Яна любіць сваю работу, цэніць і паважае рабочых, чула адносіцца да іх і заслужана карыстаецца любоўю і аўтарытэтам сярод рабочых. Дырэкцыяй фабрыкі многа разоў прэміравана.

Тав. Іваноўская з'яўляецца перадавой не толькі на вытворчасці, а і па павышэнню свайго палітычнага і агульна-адукацыйнага ўзроўню. Наведвае школу дарослых, ходзіць на лекцыі, даклады і кансультацыі па гісторыі партыі.

Яе выхавала партыя, калектыў, ленінска-сталінскі комсамол. Яна член гарадскога Совета. Акуратна рэагуе на запросы насельніцтва.

* * *

Калектывы абутковай фабрыкі імені Кагановіча і швейнай фабрыкі «Кастрычнік» вылучылі на сваіх перадвыбарчых сходах майстра цэха фабрыкі «Кастрычнік» Надзежду Пятроўну Бондараву кандыдатам у дэпутаты Мінскага абласнога Совета дэпутатаў працоўных па 36 Куйбышэўскай выбарчай акрузе горада Мінска.

Тав. Бондарава нарадзілася ў 1910 годзе ў сям'і рабочага-цесляра. У дзяцінстве Надзежда Пятроўна працавала ў краўчыхі. Калі памёр бацька ўсе пяцёра дзяцей пайшлі батрачыць на вёску да кулакоў.

У 1930 годзе малапісьменнай, некваліфікаванай работніцай тав. Бондарава паступае на швейную фабрыку. Ужо ў 1938 г. яна працуе памочнікам майстра. За час работы на фабрыцы значна выросла і стала знатным чалавекам на вытворчасці. Тав. Бондарава сістэматычна забяспечвае перавыкананне цэхам вытворчых планаў.

Працуючы на фабрыцы, Бондарава атрымала сярэднюю адукацыю. Надзежда Пятроўна з'яўляецца добрым, актыўным грамадскім работнікам. Удзельнічае ў розных камісіях і грамадскіх арганізацыях. У часе мінулых выбараў была членам акруговай выбарчай камісіі і цалкам апраўдала аказанае ёй давер'е.

* * *

Гэтыя стаханаўкі прадпрыемстваў вылучаны народам кандыдатамі ў дэпутаты. Яны змогуць адстаяць інтарэсы народа і будуць дзяржаўнымі дзеячамі Сталінскага тыпа.

Мінск. **Фёдарава.**

16 лістапада ў памяшканні клуба фабрыкі імені Клары Цэткін адбыўся перадвыбарчы сход Молатаўскай выбарчай акругі г. Масквы, на якім выступіла Герой Совецкага Саюза М. М. Раскова, вылучаная кандыдатам у дэпутаты Маскоўскага абласнога Совета.

На здымку: М. М. Раскова гутарыць з групай прадстаўнікоў прадпрыемстваў і грамадскіх арганізацый. Фота М. Рунэ (Фотакліша ТАСС)

У выбарчых камісіях

У Чашніцкім раёне шырока разгорнута падрыхтоўка да выбараў у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных. Рабочыя і работніцы, калгаснікі і калгасніцы, інтэлігенцыя—паслалі сваіх лепшых таварышоў для работы ў выбарчых камісіях. Сярод абраных таварышоў многа жанчын.

Членамі раённай выбарчай камісіі працуюць старшыня калгаса «Ударнік», Старжавіцкага сельсовета, ордэнаносец тав. Марчанка і ордэнаносец-звеннявая калгаса «Чапаеў», Альшанскага сельсовета, тав. Аз'ява.

Таксама многа жанчын працуе старшынямі і намеснікамі старшынь выбарчых камісій. Вось тав. Баркевіч Анастасія, калгасніца калгаса «Шлях соцыялізма», з'яўляецца старшынёй Альшанскай выбарчай камісіі па выбарах у сельскі Совет. Старшынёй Цяпінскай выбарчай камісіі працуе тав. Атрашкевіч Марфа.

Такіх прыкладаў можна прывесці вельмі многа. І ўсе гэтыя жанчыны, якім партыя даверыла такі вялікі і адказны ўчастак работы, з сваімі абавязкамі спраўляюцца добра.

Чашнікі. **І. Каган.**

ДЭПУТАТ кіруе заводам

Дырэктарам Красналуцкага ільнозавода Халопеніцкага раёна працуе член партыі, дэпутат Вярхоўнага Совета Беларускай рэспублікі Анна Александраўна Кракоўская. Работніцы любяць яе за жывасць, прастату, паважаюць за ўмелае кіраўніцтва.

Тав. Кракоўскую кожную раніцу можна бачыць на прыёмным двары. Яна сама прымае трасту, прывезеную з калгасаў. І тут-жа гутарыць з калгаснікамі аб загатоўцы ільнотрасты для завода. Анна Александраўна часта бывае ў калгасах. Многа работае па загатоўцы ільнотрасты, і завод за першыя кварталы выканаў план загатоўкі на 75 проц. усяго гадавога задання.

Работа на заводзе ідзе паспяхова. План другога квартала гэтага года завод выканаў на 104 проц., а трэцяга квартала—на 156 проц.

Аршанскі ільнокамбінат атрымоўвае ад Красналуцкага завода сыравіну добрай якасці. Ніколі яшчэ тав. Кракоўская і ўвесь калектыў не чырванелі за сваю фабрычную марку.

Калектыў рабочых завода—гэта ў асноўным людзі з калгасаў, жанчыны, якія любяць і ведаюць справу ільнаводства. Яны прышлі сюды, на завод, з калгасных палёў, ферм. Тут авалодалі складанай механікай станкоў, набылі новыя прафесіі і з'яўляюцца стаханаўкамі.

Вось Еўгенія Васільеўна Валасач—былая калгасніца сельскагаспадарчай арцелі імені Сталіна, Красналуцкага сельсовета, норму падвязчыцы доўгага валакна выконвае на 200 процантаў. Работніца сушылак Ольга Семенік штодзённа заданне выконвае на 150 процантаў.

Цэлы рад работніц на заводзе за ўпартай працай непазнавальна выраслі. Брыгадзірам швінг-турбіны працуе Кацерына Пятроўна Камянец. На завод яна была прынята звычайнай работніцай сушылак. За кароткі тэрмін скончыла тэхвучобу на «выдатна» і цяпер кіруе брыгадай швінг-турбіны. Брыгада з'яўляецца перадавой на заводзе. Амаль уся стаханаўская.

Кацерыну Пятроўну Камянецкую рабочыя абралі прафоргам завода. З даручанай работай малады прафорг спраўляецца добра. На ўсе скаргі, якія паступаюць, яна своечасова і паспяхова рэагуе.

На заводзе ёсць работніцы, якія маюць па дзве і нават больш прафесій. К прыкладу можна ўзяць Наталлю Сямёнаўну Марковіч. Яна з'яўляецца зменным майстрам. У апошні час выконвае яшчэ і работу брыгадзіра сыравіннага двара.

У клееварцы Бабруйскага фанернага завода імені Кірава раней ніколі не працавалі жанчыны. Пасля прамовы тав. Молатава па радыё ў гэты цэх прышлі працаваць жанчыны.

На здымку: Першыя жанчыны-клееваршчыцы: Г. І. Акуліч (злева) і Н. І. Пірог.

Фота Розельмана (Фотахроніка БЕЛТА)

Разам з заводам выросла і сама тав. Кракоўская. Многія памятаюць, як у 1932 годзе, калі фактычна першыя снапы трасты паступалі ў цэхі завода, яна маладой, стройнай дзяўчынай прышла на завод з бядняцкай сям'і селяніна. Народ аказаў ёй велізарнае давер'е—абраў дэпутатам Вярхоўнага Совета БССР. Сваёй адданай працай на заводзе, правільным вырашэннем пытанняў пастаўленых выбаршчыкамі, тав. Кракоўская апраўдвае аказанае ёй вялікае давер'е народа.

Вось як выросла Анна Александраўна Кракоўская. Так растуць тысячы людзей у краіне, дзе праца з'яўляецца справай гонару, доблесці і гераізма.

Старавойтава



Механізаваны хлебазавод-поўаўтамат, які будуецца ў Мінску. Будаўніцтва каштоўнасцю ў 6 мільёнаў рублёў будзе закончана ў 4 квартале гэтага года.

Фота Б. А. Вернера (Фотахроніка БЕЛТА).

Заможнасць

Вось калгаснае сяло. Гладкая пясчаная вуліца. У роўным строі па абодвух баках высокія дамы калгаснікаў. Шырокія, поўныя свету вокны, а на іх—свежыя фіранкі, безліч прыгожых зялёных кветак. Нават у будні дзень дамы святочна выглядаюць. Гаспадары падводзяць ужо вынікі гадавой работы, падлічваюць даходы. Мы ў калгасе імені Дзержынскага, які аб'яднае 106 двароў.

— Дзве аўтамашыны, а працуе адна,—хвалюецца старшыня.—Людзям хлеб трэба вазіць... А везці ёсць што. Зямля—маці шчодра аплачвае ўдарную працу калгаснікаў. У гэтым годзе яна прынесла ў сярэднім па трынаццаць цэнтнераў зернавых з гектара і па 200 цэнтнераў бульбы. Лепшыя-ж участкі ўжо ў гэтым годзе далі па 22 цэнтнеры зернавых з гектара. Не далёкі час, што такі ўраджай будзе на ўсёй зямлі калгаса.

І вось машына, нагружаная хлебам, ідзе да калгаснага дома. Тут гаспадар прымае зярно, як дар пачэсны і заслужаны. На яго працадзень у гэтым годзе па няпоўных падліках прыходзіцца 3 кілограмы 200 грам зернавых, каля 8 кілограмаў бульбы, прыкладна 1 рубель грашыма, парадкам гародніны, садавіны, мёду.

— Ну і што-ж вы будзеце рабіць з гэткай колькасцю прадуктаў, калі ў вас у адной 600 працадзён за дзевяць месяцаў?—пытаемся мы ў даяркі Анны Рачкевіч.

— Прадам дзяржаве,—непрымусова адказвае яна.

І як правіла, тут у калгасе імені Дзержынскага калгаснікі 50 проц. атрыманага хлеба прадаюць дзяржаве, а за гэта атрымліваюць веласіпеды, швейныя машыны, шафы, ложкі, патэфоны.

Увечары ў сям'і Нікіфара Міхайлавіча Машалава незвычайнае ажыўленне. Дачурка аддае перавагу патэфону і заводзіць яго як толькі сцямнее. Гаспадар любіць радыё. Жонка яго вырашае спрэчкі паміж мужам і дачкой і тады на змену іграе патэфон і трансліруецца класічная музыка.

Нікіфар Машалаў, Курыленка, Багдан, Лаўрыленка і многа іншых калгаснікаў жывуць на славу. У іх доме радыё, электрычнае святло, нікелевыя ложкі, веласіпеды. У любіцеляў паляванння—добрыя стрэльбы. Выпадзе першы снег і яны пойдуць на паляванне.

Калгас імені Дзержынскага прынёс сваім членам заможнасць. Ён таксама носьбіт культуры. Вось лічбы і некаторыя факты. На культурна-бытавыя патрэбы калгаснікаў за 9 месяцаў 1939 года выдаткавана 7 335 рублёў калгасных сродкаў. На яслі, піонер-лагер, кіно-абслугоўванне і т. д.

Пры калгасе працуе клуб. Усе дзеці бясплатна наведваюць няпоўную сярэднюю школу. На кожны дом выпісваецца газета, а ў многія і журналы. Ёсць свая лазня, абсталявана яна не горш гарадскіх. У мінулым не было дзе ўзяць вады, а цяпер ёсць тры калодзежы з празрыстай і добрай вадой.

Людзі калгаснага сяла ствараюць песні, пагаворкі пра былога памешчыка, валодаўшага іх зямлёй да рэволюцыі.

Яны ўпэўнена заяўляюць: «Не вернецца кату масленіца».

Так, не вернецца. Чалавек, убачыўшы дзень пасля цёмнай ночы, не захоча яе больш бачыць на сваёй жыццёвай прасторнай дарозе.

Лагойскі раён. **П. Кавалёў.**

Калгаснік сельгасарцелі „Эмес" (Прудкоўскі сельсовет, Гомельскі раён) Фёдар Іванавіч Новікаў выпрацаваў са сваёй жонкай за 9 месяцаў 460 працадзён. У лік гэтых працадзён сям'я атрымлівае 1150 кілограм зернавых, 2300 кілограмаў бульбы і многа другіх сельскагаспадарчых прадуктаў. Акрамя таго яны атрымалі 1150 рублёў грашыма.

На здымку: Сям'я калгасніка Новікава ў часе адпачынку. Фота А. Шаевіча (Фотахроніка БЕЛТА).

КОНСТИТУЦИЯ СССР, С

„Женщине в [illegible] пр
равные права с мужчиной во
хозяйственной, государстве
ной и общественно-политич
Возможность об[illegible]ества
женщин обеспечи[illegible]тся пр
женщине равного [illegible] зужч
труд, оплату тру[illegible] отды
страхование и обр[illegible]зование
ной охраной матер[illegible]в ма
предоставлением [illegible]щине
ности отпусков с [illegible]хранен
ния, широкой сет[illegible] родн
детских яслей и с[illegible]ов".

НЯХАЙ ЖЫ
РОЎНАПРАЎНАЯ ЎДЗ
АКТЫЎНАЯ ДЗ
Ў КІРАВАННІ
ГАСПАДАРЧЫМІ
СПРАВАМІ

На здымках: 1. Сакратар ЦК КП(б)Б і старшыня Вярхоўнага Совета БССР Н. Г. Грэкава (у цэнтры) і намеснікі старшыні Вярхоўна
за вывучэннем чацвертага раздзела „Кароткага курса гісторыі ВКП(б). 3. Е. Втарова—пераможніца спаборніцтва па Марафонскаму
5. А. А. Буй—звеннявая стаханаўскага жаночага звяна лесарубаў Стара-Дарожскага лесапункта, Мінскай вобласці. 6. Скульптар тав. М
8. Стаханаўка Мінскай швейнай фабрыкі „Кастрычнік" М. М. Хамянок. Яна адна з першых дзяўчат на фабрыцы аўладала спецыяльнас
імені Молатава ордэнаносцы—стаханаўкі Маруся і Дуся Вінаградавы ў лабараторыі. 10. Лепшая лабарантка канзіцерскай фабрыкі
педагагічнага інстытута за вывучэннем кулямёта. 12. Ф. І. Кабакова (72 года) член Чэрвеньскага горсовета, працуе агітатарам па п
на адпачынку ў санаторыі. 14. Героі Совецкага

Й ЖЫВЕ ЖАНЧЫНА СССР ЎДЗЕЛЬНІЦА І ДЗЯРЖАВАЙ, І КУЛЬТУРНЫМІ І КРАІНЫ!

Вярхоўнага Совета БССР Г. М. Барушкоў і Д. Н. Майораў. 2. Настаўніца 5-й Гомельскай школы, кандыдат партыі Н. Е. Жыльчык фонскаму плаванню на 15 кілометраў для жанчын. 4. А. А. Мельнікава—начальнік станцыі Кутузава Маскоўскай акруговай чыгункі. тар тав. Мухіна. 7. Дэпутат Вярхоўнага Совета Саюза ССР—старшыня калгаса Т. В. Дубок разбірае заяву калгасніка Івасенка. ецыяльнасцю ўцюжцы гофманскімі прасамі і перайшла на абслугоўванне 5 прэсаў адначасова. 9. Студэнткі Прамысловай акадэміі фабрыкі „Красный мозырянин" (Нароўля, Палескай вобласці) Т. Ф. Афінагенава за работай. 11. Група студэнтаў Магілеўскага рам па падрыхтоўцы да выбараў у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных. 13. Лепшыя зборшчыцы бавоўны калгаса „Украіна" овецкага Саюза В. Грызадубава і М. Раскова.

Выканалі наказ народа

Мы, дэпутаты Народнага Сабрання з гонарам выканалі наказ нашага народа. На тэрыторыі Заходняй Беларусі ўстаноўлена Совецкая ўлада. На народным сабранні ў Беластоку была выбрана Паўнамоцная дэлегацыя, якая ездзіла ў Маскву на Пятую Ўнечарговую Сесію Вярхоўнага Совета СССР прасіць вялікі народ Совецкага Саюза аб далучэнні нас да Краіны соцыялізма. Нашу просьбу задаволілі. Мы ўключаны ў вялікую сям'ю народаў СССР і з'яднаны навечна з адзінакроўнымі братамі Беларускай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі.

Мы, дэлегаты, прыехалі ў Чырвоную Маскву—сэрца Совецкай краіны. Горад здаўся нам казкай. Ніколі не згладзіцца з памяці ўражанне, якое засталося ад усяго таго, што мы бачылі. Мы бачылі свабодных людзей, якія так проста і смела выказваюцца аб сваім шчаслівым жыцці. Кожная арганізацыя, калектывы прадпрыемстваў, фабрык і заводаў гасцінна нас прымалі. Кожны хацеў з намі пагутарыць аб вялікіх дасягненнях, якіх дабіўся Совецкі Саюз за годы соцыялістычнай рэволюцыі.

Мы ў Маскве многа чаго бачылі. Усё нас так вабіла, усім мы цікавіліся, бо ўсё, што мы бачылі, здабыта самімі працоўнымі.

Совецкі народ пабудаваў вялікія, раскошныя жыллёвыя дамы, велізарныя заводы, фабрыкі. Жывуць працоўныя ў поўным дастатку. Навука і культура прадастаўлены народным масам. Кожнаму грамадзяніну Совецкага Саюза—старому ці маладому, жанчыне ці мужчыне—адкрыта шырокая дарога ў жыццё, навуку, да працы, да адпачынку.

Неперадаваемае ўражанне ў мяне засталося ад пасяджэння Сесіі Вярхоўнага Совета СССР. На Сесію прыехалі людзі многіх

У Заходняй Беларусі.

— А мы з табой равеснікі, унучак: і ты і я ўбачылі свет гэтай восенню.

Малюнак В. Баркова і Ю. Леўчэнка.

(Фота-клішэ ТАСС).

Дэпутат Вярхоўнага Совета БССР тав. Харытановіч (справа) гутарыць з членамі Поўнамоцнай Камісіі Заходняй Беларусі на Трэцяй Унечарговай Сесіі Вярхоўнага Совета БССР.

нацыянальнасцей і ўсе разам вырашалі дзяржаўныя пытанні. Бязмежная радасць ахапіла мяне, калі я ўбачыла вялікага тварца шчасця народаў таварыша Сталіна.

Незабыўны ў маім жыцці той момант, калі дэпутаты Вярхоўнага Совета СССР прагаласавалі аб далучэнні Заходняй Беларусі да вялікага Совецкага Саюза. І тут мімаволі я ўспомніла і параўнала цяжкае жыццё свайго народа пад ярмом польскіх паноў і капіталістаў з цудоўным жыццём працоўных Совецкага Саюза.

Польскія заправілы давялі народы Заходняй Беларусі да кашмарнага жыцця. Дзеці нашага народа былі патоплены ў сваёй уласнай крыві. Працоўны народ яны замучылі турмамі і ссылкамі. І вось цяпер мы ўпершыню вольна, усімі грудзьмі ўздыхнулі, ва ўвесь голас загаварылі. І кожны з нас з гонарам заяўляе, што ён свабодны грамадзянін Совецкага Саюза.

Станішэўская—дэпутат Народнага Сабрання.

м. Мір.

Дзякуй вам, родныя

У гэтыя радасныя дні, калі я—сялянка Заходняй Беларусі знаходзілася ў чырвонай сталіцы Беларускай Рэспублікі—горадзе Мінску, хочацца мне ад усяго сэрца расказаць вам, шчаслівым жанчынам краіны соцыялізма, аб сваёй радасці, аб сваім шчасці. Я—дэпутат Народнага Сабрання Заходняй Беларусі была паслана ў Мінск для святкавання XXII гадавіны Вялікай Кастрычніцкай рэволюцыі. Таксама я прымала ўдзел у рабоце Трэцяй Унечарговай Сесіі Вярхоўнага Совета БССР, дзе было вырашана пытанне аб далучэнні Заходняй Беларусі да Совецкай Соцыялістычнай Беларусі.

Вельмі цяжка на паперы апісаць усё тое, што бачылі і адчувалі мы—пасланцы нашага народа ў гэтыя радасныя дні. Нас сустрэлі, як родных сясцёр і братоў, як самых дарагіх і доўгачаканых гасцей. Мы сваімі вачамі ўбачылі якім цудоўным горадам з'яўляецца Мінск, як радасна жывуць працоўныя Совецкай Беларусі. На станка-будаўнічым заводзе імені Кірава мы бачылі выдатныя машыны, вялікія карпусы. Мы бачылі, што рабочыя і работніцы працуюць у добрых умовах, што дзяржава забяспечвае ім гэтыя ўмовы для работы. Мы бачылі там добрую сталовую для рабочых, дзіцячы сад і іншыя бытавыя ўстановы.

Пабывалі мы і ў калгасах Бабруйскага раёна. Польскія паны вельмі многа брахалі аб калгасным жыцці. Мы сваімі вачамі ўпэўніліся, якая гэта хлусня. Мы бачылі, як заможна і радасна жывуць калгаснікі, як добра яны забяспечаны. Мы пабывалі ў калгасных хатах, у свірнах поўных усякага збожжа, у добрых кароўніках. Асабліва моцнае ўражанне на мне асабіста пакінула жыццё совецкіх рэбят. Калі я гаварыла з дзецьмі пры наведванні Палаца піонераў, я плакала ад радасці, што ёсць на свеце дзеці, якія не ведаюць нястачы і адчаю. Я думала—хутка і нашы дзеці атрымаюць шчаслівае дзяцінства.

Мне, як і многім мільёнам работніц і сялянак у панскай Польшчы, жыццё было гарчэй палыну. У 13 год пайшла я здабываць сабе кавалак хлеба. Працавала работніцай. Выбілася і ў прыказчыцы, але беспрацоўе і галеча адчуваліся на кожным кроку. Будучы беспрацоўнай рашыла выйсці замуж за чалавека многа старэйшага за сябе. Думала—у яго ёсць тры дзесяціны зямлі, можна будзе пражыць. Але глыбока памылілася. Жыццё малазямельнага селяніна мала адрознівалася ад жыцця рабочага. Нас заядалі падаткі панскай Польшчы. Наша сям'я была на асаблівай падазронасці. Муж, за ўдзел у рэволюцыйнай рабоце, быў асуджан на 5 год. Па два разы на дзень прыходзіла паліцыя. Колькі здзекаў прышлося перанесці. Мы былі пазбаўлены грамадзянскіх правоў.

Бязрадасным было жыццё маіх пяцярых дзяцей. Яны хадзілі абарванымі, нават не мелі рубашкі на целе. Мы жылі ў маленькай хатцы, якая 60 год не рамантавалася. Заправілы горада рашылі яе знесці. Тады я пабегла да бурмістра (главы горада) і пытаюся, што мне рабіць з рэбятамі, куды іх дзець. Зусім спакойна ён адказвае: «Возера вялікае—ты іх патапі». Лепшага нельга было чакаць ад такога крывапійцы.

Хачу расказаць аб такім выпадку—зусім звычайным для былой Польшчы. Мой муж хварэў грыпам, а пасля гэтага цяжка захварэў почкамі. Патрабавалася тэрміновая аперацыя. У вельмі цяжкім становішчы я завезла яго ў больніцу, але ўрач не ўзяўся рабіць аперацыі раней, чым я заплачу за гэта 25 злотых. Дзе было ўзяць гэтыя грошы? Пакінуўшы мужа, я пабегла дамоў, вывела апошнюю карову з хлева, прадала яе за бясцэнак і тады прынесла грошы доктару.

Усё гэта цяпер перажыта. Ніколі больш у нас не будзе ўжо такіх парадкаў. Вялікі Совецкі Саюз працягнуў нам брацкую руку дапамогі. Вялікая Чырвоная Армія вызваліла нас ад іга паноў. Дзякуй вам, родныя браты і сёстры, за наша вызваленне.

Л. П. Петух—дэпутат Народнага Сабрання.

г. Глубокае, Вілейскай вобласці.

У жудасных умовах жыла беднота ў белапанскай Польшчы.
На здымку: Жыллё селяніна-беднякa ў прадмесці г. Глубокае.
Фота А. Фрыдлянскага (Фотахроніка БЕЛТА).

У адзінай дружнай сям'і

Дваццаць год беларускую зямлю раздзялялі пагранічныя слупы; яны фармальна аддзялялі нашых адзінакроўных шчаслівых братоў ад нас, прыгнечаных былой Польшчы. Цяжка нават успомніць аб нашым жыцці. Не было прасвету ў пакутлівых днях. Вечныя здзекі, катаванні, эксплаатацыя—вось што мы пераносілі. Працавалі мы на фабрыцы ў самых жудасных умовах. У цэхах было цёмна, вільготна і халодна. Адсутнічалі вентылятары. Нас не лічылі за людзей і ніхто аб нас не клапаціўся.

У часы работы па цэхах пыл стаяў слупам. Дыхаць не было чым. Часамі прыходзілася спыняць машыны, адчыняць дзверы і праветрываць цэхі. Так мы рабілі па некалькі разоў у дзень, бо інакш нельга было зусім працаваць. Між тым гэта рабілася так, каб гаспадар не ведаў, бо сурова было забаронена ствараць сабе ўмовы для працы. Тэхніка безапаснасці наогул не існавала. Машыны не былі агароджаны. Штодзённа здараліся калецтвы рабочых, якія ў большасці канчаліся смерцю. Рабочыя і работніцы прабавалі патрабаваць ад гаспадара зрабіць вентыляцыю, але ён і слухаць не хацеў. Адказ гэтага крывапіўца быў адзіны: «Калі работніца і загіне, то на яе месца стануць тысячы».

Майстар цэха — прыслужнік заводчыка пільна сачыў за кожным нашым рухам. На фабрыцы працавалі нашы мужы і дзеці. І што-ж мы атрымлівалі за гэту знясіляючую работу ў жудасных умовах, у вільготных цёмных цэхах? Жалкія грашы, якіх ледзь-ледзь хапала для сям'і на хлеб. Аднак работу мы не маглі кідаць. Беспрацоўных было многа. Толькі некаторым шчасліўцам удавалася працаваць па некалькі год падрад на прадпрыемстве, а большасць рабочых працавала не больш 3-х месяцаў у год.

Уходзячы на работу мы пакідалі сваіх дзяцей безнагляднымі, прывязвалі іх да сталоў. Старэйшых трэба было вучыць, а за вучэнне плацілі па 250 злотых у год. Дорага каштавалі кнігі і сшыткі. Нашы дзеці галадалі. Не хапала грошай на прадукты. У выніку пакутлівых умоў жыцця дзеці захворвалі і многія паміралі. А тыя, якія выжывалі, былі хілымі, слабымі і заставаліся калекамі на ўсё жыццё.

Атрымлівалі мы за работу ўсяго 26 злотых і 30 грошай у тыдзень. З гэтых мізэрных заработкаў фабрыкант вылічваў у карысць дзяржавы, на паветраны флот і розныя фашысцкія арганізацыі па 4 злотых. Калі работніца траціла працаздольнасць, або захворвала, яе адразу звальнялі з работы, а на яе месца бралі другіх.

Група былых беспрацоўных Заходняй Беларусі паступіла на работу ў бухгалтэрыю Магілёўскай шоўкавай фабрыкі імені Куйбышэва.

На здымку: Галоўны бухгалтар фабрыкі І. Д. Геллер навучае былых беспрацоўных савецкаму метаду ўліка. Злева направа: І. Д. Геллер, Б. З. Касоўская Л. І. Пельцэр і Б. І. Пельцэр.

Фота А. Розельмана (Фотахроніка БЕЛТА)

Прышоў новы час. Чырвоная Армія вызваліла нас, працоўных людзей ад цяжкага гнёту. Мы ўпершыню ўздыхнулі свабодна. Прадаставілі нам права рашыць свой лёс і будаваць жыццё, аб якім мы толькі марылі. Перад намі адкрыўся шлях да светлай будучыні. На фабрыцы мы ўпершыню атрымалі водпуск. Мы тэкстыльшчыцы, як вольныя, шчаслівыя грамадзяне Совецкай краіны, абралі дэпутатам Народнага Сабрання сваю радавую работніцу, прадзільшчыцу Гродэк-Зеленкевіч.

Узышло сонца, пад яго праменнямі пачалося новае шчаслівае жыццё. Мы не знаходзім слоў, каб выказаць нашу радасць і падзяку правадыру працоўных усяго света роднаму Сталіну і ўсяму совецкаму народу, які прыняў нас у вялікую дружную сям'ю.

Браніслава Зімнох, Анастасія Каліта, Анастасія Раманчук, Ольга Войцэшук—работніцы тэкстыльнай фабрыкі.

гор. Беласток.

Работніцы Беластоцкай тэкстыльнай фабрыкі ў часе абедзенага перапынку чытаюць Сталінскую Канстытуцыю. (Фотахроніка БЕЛТА).

ДАРАГІ ПАДАРУНАК

У нядзелю Вадзік прасынаўся раней звычайнага. У гэты дзень бацька звычайна ішоў у панскі маёнтак на работу пазней чым заўсёды гадзіны на дзве-тры, і Вадзік упрашваў бацьку зрабіць яму пугу ці вінтоўку, бо куплёных цацак у дзевяцігадовага Вадзіка ніколі не было. А потым, калі бацька ўходзіў, Вадзік ужо больш увесь дзень яго не бачыў.

— Ганна, Ганна,—прыставаў ён да старшай сястры, а іншы раз да маці,—дзе наш татка ўвесь дзень?

— У маёнтку.

— А чаму ён не прыходзіць?

— Ён працуе, пан не пускае, есці не дае.

Хоць маёнтак пана Важэцкага быў пад бокам, якіх-небудзь два-тры кіламетры ад вёскі, дзе жыла сям'я Вадзіка, ні ён, ні Ганна ні разу там не былі. Пан быў скупы, вартавых трымаў мала, але былі ў яго злосныя сабакі на ланцугах і пан цкаваў іх на дзяцей. Аднойчы ўвосень сабака пана пакусаў стрыечную сястрычку Вадзіка—дзевяцігадовую Крыську, якая збірала ў панскім лесе грыбы. Бацька Вадзіка першы ўбачыў разарваную дзяўчынку, яна ляжала прытуліўшыся да дрэва без дыхання, з закрытымі вачыма, зыходзячы крывёю. Ён асцярожна падняў яе і аднёс да сябе дадому. Потым уся вёска прыбегла ў дом да Вадзіка, глядзець на афяру сабакі пана Важэцкага. Многае, што гаварылі ў той дзень у доме, Вадзік не разумеў, гаварылі шэптам, а калі і ўзнімалі голас, то Вадзік не мог уявіць сэнсу сказанага. Дзед Пятро прапанаваў падаць у суд.

— Што такое суд?—пачаў прыставаць Вадзік да Ганны.—Скажы, скажы.

— Адчапіся,—злосна адказала яна яму.—Не да цябе цяпер, бачыш як Крысеньцы дрэнна.

Але хаця дзеда Пятра паважалі, усе сяляне ў адзін голас загудзелі, што суд нічога пану Важэцкаму не зробіць, таму што будзе яго судзіць той-жа пан. Дачка дзеда Пятра—восемнаццацігадовая Нюра, якая ўжо сядзела год у турме, калі ў хаце зусім стала ціха, сказала:

— Пусціць-бы Важэцкаму «пеўня». Гэтага Вадзік зусім не зразумеў. Якога пеўня? Хіба ў паненчыным маёнтку мала пеўняў і курэй? Ого, колькі іх там!.. А пану Важэцкаму нічога за Крыську так і не зрабілі—ні ў суд не падалі, ні «пеўня» не пусцілі. Дзеці-ж з таго часу абыходзілі маёнтак за вярсту і больш.

Маленькі Вадзік часта прыставаў да бацькі:

— Бацька, бацька, а калі я пайду ў школу?

Бацька задумліва гладзіў дзіця па мяккіх валасах і казаў:

— Відаць, Вадзік, не прыдзецца табе ісці ў школу—вунь і Ганка не хадзіла. На нашай на беларускай мове не вучаць, а на польскай не хочу.

Прачнуўшыся і хутка апрануўшыся, Вадзік вышаў на вуліцу пашукаць бацьку. Ён некалькі разоў пагукаў яго, але ніхто не адзываўся. Раптоўна штосьці прашумела над галавой Вадзіка. Ён паглядзеў на неба і здзівіўся—ляцелі самалёты. Іх з'яўленне было вялікім дзівам для гэтых месц. Вадзік убег у хату і яшчэ з парога крыкнуў Ганны:

— Ганка, выходзь! Паглядзі, самалётаў многа самалётаў з зорачкамі!..

На трох лепшых конях праехаў пан Важэцкі, апрануты ў цёплую футру, а ззаду прыгожай павозкі былі прывязаны чамаданы.

— Куды-б гэта ён?—падумаў Вадзік і прабег трохі ўслед. Ён убачыў як павозка пана Важэцкага звярнула ў бок возера.—Што яму там трэба? Там-жа і пашы няма,—задумаўся хлопчык, варочаючыся назад. І раптам перад ім выраслі коннікі. Вадзік ніколі да гэтага часу не бачыў такіх. На вялікіх прыгожых канях, быццам як у пана Важэцкага, на ўпрыгожаных сёдлах, а самі ў круглых футравых шапачках і паліто ў іх не як ва ўсіх, а накінута на плечы без рукавоў. Вадзік хацеў бегчы, але той, што ехаў уперадзе, пазваў яго. Больш за ўсё здзівіла Вадзіка, што ён паклікаў яго на рускай мове.

— Хлопчык, ты тут польскіх афіцэраў не бачыў?

— Не, пане!

— Ну, а памешчык каля вас ёсць?

— Важэцкі?—запытаў Вадзік

— Няхай Важэцкі!

— Ён толькі, толькі праехаў да возера на тройцы, а там і дарогі зусім няма.

— Вось за гэта, што сказаў—дзякуй!

Самы апошні пад'ехаў да Вадзіка і, злазячы з каня, даў яму картку.

— На, павесіш дома...

Вадзік узяў картку і не паспеў запытаць хто гэта. На картцы быў незнаёмы чалавек з простым, добрым тварам. Ён глядзеў на Вадзіка і быццам усміхаўся.

— Ну, цяпер Ганка паверыць, што былі самалёты— радуча падумаў Вадзік і паскакаў да дому. Ганна бегла яму насустрач.

— Дзе ты ходзіш?

— Ганна, а глядзі, што мне далі.— Сястра ўзяла картку і прачытала: Сталін.

— Вадзік, гэта Сталін, гэта самы галоўны чырвоных.

Вадзік узяў зноў картку і пачаў глядзець. Цяпер ён і сам па літарах прачытаў: Сталін. Яму вельмі спада. баўся твар гэтага дзядзі і ён нават не чуў, што ў яго пыталася Ганна.

— Хто-ж табе даў? Вадзік, чуеш?

— Сталін—паўтарае гучнае прозвішча, трымаючы картку перад вачыма Вадзік.

— Сталін даў?—здзівілася Ганна.

У гэты час з-за вугла паказалася павозка Важэцкага, абкружаная байцамі. Казакі заўважылі Вадзіка і на мінуту спыніліся каля яго.

— Дзякуй хлопчык, што паказаў, пан уцякаць надумаў.

— Ён даў, ён даў,—некалькі разоў паўтарыў Вадзік,—паказваючы на казака, які ехаў у апошнім радзе. Цяпер Ганна зразумела ў чым справа і ад радасці падхапіла Вадзіка. Моцна, моцна прыціснула яго, потым беражліва ўзяўшы з рук Вадзіка партрэт Сталіна паднесла яго да вуснаў і пацалавала. На вачах у сястры брат заўважыў радасныя слёзы.

Нядаўна нам давялося пабываць у палацы пана Важэцкага. Нядрэнны палац і школа ў яго прыгожых, прасторных пакоях атрымалася цудоўнай. Вадзік, Крыська і другія дзеці зусім не баяцца цяпер хадзіць сюды. Крыська і Вадзік кожную раніцу спяшаюцца ў школу. Батракі выбралі бацьку Вадзіка старшынёй камітэта і бацька яго працуе ў палацы. Часамі бацька бачыць як весяляцца дзеці батракоў у былым панскім доме. Гуляюць у чырвоных, вучаць беларускія вершы, наладжваюць «дэманстрацыі» і сэрца батрака напаўняецца бязмежнай радасцю. Дзеці вырастуць людзьмі, ім не пагражае голад,—думае ён, не адрываючы вачэй ад прыгожых дзяцей, якія быццам расцвілі і сталі непазнавальнымі.

Картку, якую падарыў казак, Ганна і Вадзік берагуць, як самае дарагое. «Гэта-ж той, хто ў палац пана Важэцкага пусціў. Сталін... Сталін пусціў»—важна расказвае Вадзік аб сваёй незабыўнай сустрэчы з байцамі ў вераснёўскі дзень раніцой.

Столбецкі уезд Садоўскі.

У дзіцячых яслях № 13 Сталінскага раёна горада Мінска.
Фота В. Баранава (Фотахроніка БЕЛТА).

Так „лячылі“ ў панскай Польшчы

Бязрадасным і цяжкім было жыццё жанчыны ў былой панскай Польшчы. Яна была бяспраўнай. Да навукі, да ведаў дарогі былі зачынены. Дзяржава не клапацілася аб жанчыне, аб дзецях.

Ва ўсім Валкавыскім павеце на 18 тысяч насельніцтва была адна толькі больніца з радзільным пакоем на 9 ложкаў і тая знаходзілася ў горадзе. У больніцы хворых прымаў адзін урач па розных хваробах. Хворых было многа, а ўрачы, скончыўшыя ўніверсітэты, блукалі па вуліцах беспрацоўнымі, у тым ліку быў і я.

Прывяду некалькі прыкладаў, з якімі прыходзілася сустракацца на кожным кроку.

Вось прыходзіць у амбулаторыю цяжарная жанчына. Ёй засталося два-тры дні да родаў. Яна слабая, ледзь трымаецца на нагах. Работніца непісьменная. Урач агледзіў яе скоса з ног да галавы і грозна прагаварыў: «Ідзі раджай дзе хочаш. Трэба было раней прыйсці да мяне і запытацца ці можна было табе, беднай работніцы, выходзіць замуж. У нас больніца платная, а ты не маеш грошай. Акушэркі на дом я таксама не дам. Захацела раджаць, а цяпер да мяне прыходзіш».

Жанчына са слязмі на вачах ўмаляе: «Прыміце мяне ў больніцу. Я жыву ў маленькім цесным пакойчыку, разам яшчэ з двумя сем'ямі». Але ніякія просьбы не дапамагаюць. Доктар адказвае адно—«не прыму».

Часамі доктар быў у добрым настроі. Ён прымаў цяжарных жанчын у больніцу, аднак праз 3—4 дні выпісваў хворых. Амаль усе сялянкі раджалі на даму пры дапамозе бабкі-павітухі. Рожаніцы ляжалі ў брудным, цесным памяшканні. У такіх умовах дзеці часцей усяго з'яўляліся на свет нежывымі, быў таксама вялікі процант смяротнасці сярод рожаніц.

А ці-ж мала такіх выпадкаў, калі беднасць і нястача прымушалі сялянку-дзяўчыну з вёскі ісці ў горад у пошуках работы? Там работы яна сабе не знаходзіць, выпадкова знаёміцца з мужчынай 45—50 год. Ён хворы сіфілісам. Стварыўшыяся абставіны прымушаюць бедную сялянку выйсці за яго замуж. Яна заражаецца, а лячыцца не мае сродкаў. Так гінулі сотні жанчын, не знаходзячых сабе выйсця з цяжкога становішча.

Альбо такія звычайныя з'явы: у сям'і рабочага захварэла дзіцё. Тэмпература ў яго высокая, моцныя болі. Яму патрэбна хуткая медыцынская дапамога. Каб запрасіць на дом урача і купіць лякарства трэба было заплаціць многа грошай. А дзе іх узяць? Бацькі беспрацоўныя і ў доме няма ні аднаго гроша нават на хлеб. Дзіця галоднае без урачэбнай дапамогі памірае.

Такіх прыкладаў можна прывесці многа. Гэта не выпадковасць, а звычайная масавая з'ява, такі быў лёс рабочых, сялян і інтэлігенцыі былой панскай Польшчы.

Рабочыя, сяляне і інтэлігенцыя з першага дня прыходу часцей Чырвонай Арміі атрымалі самую кваліфікаваную медыцынскую дапамогу. У гарадах, вёсках арганізаваны новыя больніцы, у якіх працуюць самыя лепшыя ўрачы і абслугоўваючы медыцынскі персанал. І ўсё гэта бясплатна. Працоўнае насельніцтва вельмі ўдзячна сваім вызваліцелям—Чырвонай Арміі і правадыру ўсіх працоўных таварышу Сталіну.

Валкавыск. **Урач. Ш. А. Маркус**

Лепшая ўлада ў свеце

Жыццё маёй сям'і нічым не адрознівалася ад жыцця ўсяго сялянства, якое стагнала пад паганым ботам польскіх паноў і магнатаў. У маёй сям'і было 7 душ. Зямлі мелі толькі два гектары. Цяжка было пражыць і вось я працавала 30 год у маёнтку крывапіўца-памешчыка. Улетку дзень у дзень хадзіла на палявыя работы. Зарабляла ўсяго паўтара-два злотых у дзень, а зімой 50—60 грошай.

Жылі ў пастаянным недаяданні. Хлеб і бульбу елі толькі ў першыя дні пасля збору ўраджаю, потым пераходзілі на лебяду і мякіну. Вялікай роскашшу лічыліся ў нас запалкі, соль і карасіна. Пра вопратку і казаць няма чаго. На ўсю сям'ю з сямі душ мелі толькі адзін кажушок.

Падаткі плацілі вялікія. Калі не хапала грошай панскія прыслужнікі здзіралі апошнюю адзежыну з плеч. Тры злотых яшчэ прыходзілася плаціць за тое, што стараста «пажалаваў» ў хату. А дзе было ўзяць грошы? Не жыццё было, а катарга.

Цяпер заззяла сонейка над нашай зямлёй. Мы сталі вольнымі гаспадарамі зямлі, якая па праву належыць нам, яна сялянскай крыўю і потам аблita. Пан меў некалькі дзесяткаў тысяч гектараў зямлі. Зараз гэту зямлю падзялілі сялянам. Я таксама атрымала пяць гектараў. Мне прывезлі ўжо дровы. Я на справе адчула, што самая лепшая ўлада ў свеце—Совецкая. Мы шчаслівы, што прышоў канец нашым пакутам. І над намі яркімі праменнямі засвяціла сонца сталінскай праўды. Мы ва ўвесь голас можам заявіць, што мы больш не рабы, а роўнапраўныя ўдзельнікі і будаўнікі новага прыгожага шчаслівага жыцця.

Я ўжо не маладая, але хочацца яшчэ жыць і жыць.

Анастасія Віктараўна Мазур.

в. Гарнаставічы,
Валкавыскага павета.

г. Баранавічы, які мае 40 тысяч насельніцтва не меў пункта хуткай дапамогі. Здраўаддзел пры Часовым управленні горада адчыніў на днях першы пункт хуткай дапамогі.

На здымку: дзяжурная медсястра Е. А. Шпаковіч прымае тэлефонны выклік да хворага.

Фото Д. Чэрнова (Фотахроніка БЕЛТА)

Курсанты Віцебскай школы павышэння кваліфікацыі калгасных работнікаў—старшыні калгасаў вобласці за самастойнай падрыхтоўкай да заняткаў па гісторыі народаў СССР. Злева—направа тт. Е. П. Палітычэнка, М. А. Юркова, Х. І. Усцінава і С. С. Быкоўская. Фота Б. Хеніна (Фотахроніка БЕЛТА).

Аб нашым калгасным жыцці

На трэцяй Сесіі Вярхоўнага Совета БССР, якая зацвердзіла далучэнне вызваленай Заходняй Беларусі да БССР я пазнаёмілася з членамі Паўнамоцнай Камісіі Народнага Сабрання. Усе яны вельмі цікавіліся нашым жыццём. З трыбуны Вярхоўнага Совета і ў прыватнай гутарцы расказвалі аб здзеках над працоўным народам у былой панскай Польшчы, аб нечуванай эксплаатацыі, якую ім прыходзілася пераносіць.

Слухаючы іх я думала аб жыцці ў Совецкай краіне, аб нашых жанчынах—гераінях працы, асабіста аб сваім калгасе. Вось я жанчына кірую калгасам «Першае мая», Цяцерынскага сельсовета. Калгас багаты, людзі жывуць у ім культурна і заможна. З палёў у гэтым годзе знялі багаты ўраджай.

Нашы жанчыны - калгасніцы працуюць добрасумленна. Любяць сваю работу і дабіваюцца выдатных поспехаў. Узяць, напрыклад, Анну Конанаўну Марозаву. Яна працавала на аўцагадоўчай ферме. За 1938 год тав. Марозава дабілася таго, што на кожную аўцэматку ў сярэднім прыходзілася па 2 з паловай ягнят. Дзякуючы гэтаму Анна Конанаўна ўдастоілася вялікага гонару—удзельнічала ва Ўсесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўцы 1939 года.

На выстаўцы была і я. Бачыла дасягненні нашых калгасаў, звычайных калгаснікаў, дасягненні і багацці ўсёй рэспублікі, усёй краіны. Бачыла чырвоную сталіцу—Маскву, метро, многапавярховыя будынкі, прыгожыя вуліцы.

Які вялікі ўздым у рабоце нашых калгаснікаў выклікала выстаўка! Яны абяцалі працаваць так, каб заваяваць права ўдзелу ў выстаўцы 1940 года.

Наш калгас мае ільнаводчы ўхіл. У мінулым годзе было засеяна 60 гектараў ільну. Арганізаваны дзве ільнаводчыя брыгады, якімі кіруюць Малання Сямёнаўна Астроўская і Анастасія Харытонаўна Саплюкова. Яны паміж сабой спаборнічаюць. Абедзве брыгады ўжо разгарнулі шырокую падрыхтоўчую работу, змагаюцца за права ўдзелу ў выстаўцы. Лён у гэтым годзе на іх участках вельмі добры. Уся траста здадзена дзяржаве высокім нумарам. Насённе ільна да пасеўнай падрыхтавана, ачышчана. Выбраны ўчасткі для пасева, у абодвух брыгадах збіраюць угнаенне—курыны памёт, попел.

Калгас з'яўляецца перадавым у раёне. Мы паспяхова разлічыліся з дзяржавай па хлебапастаўках і мясапастаўках.

Закон аб далучэнні Заходняй Беларусі да нашай ордэнаноснай Совецкай Беларусі я разам з усімі дэпутатамі рэспублікі вітаю шчыра ад усяго сэрца. Мы хочам, каб і ў іх на вызваленай зямлі так красавалася і расло багацце, раслі фабрыкі і заводы, каб і працоўныя заходніх абласцей Беларусі жылі так весела, заможна і шчасліва, як мы.

Каб іх дзеці, як і нашы, былі кветкамі жыцця. Ад усяго сэрца шлю вызваленым братам і сёстрам шчырае, палкае дэпутацкае прывітанне.

Ярковіч Ольга Авілаўна.

Круглянскі раён.

Якуб Колас

ВЫБАР СТАРШЫНІ

Ніжэй мы змяшчаем апавяданне народнага паэта БССР Якуба Коласа, у якім ён паказаў як праводзіліся выбары валаснога старшыні ў царскай Расіі.

Ужо ад самага ранку крычалі выбарныя. Многа выпілі гарэлкі, а яшчэ больш піва.

У воласці я застаў пісара і яго памочніка. Заглядаў сюды так-жа дзед—стораж з чырвоным носам—табаку зажываў ды ў гарэлцы быў не дурань. Ён здзьмухаў пыл, прыбіраў, як перад калядамі. Чакалі земскага.

А на «зборнай», як на кірмашы, гаманіў сход.

— Ось хіба сягоння пілі дык пілі!—кажа памочнік.—Гарэлку не чаркамі лічылі, а шклянкамі. Старшыня адразу даў дваццаць пяць рублёў, а калі выберуць яго, то яшчэ, казаў дасць гэтулькі. У нас ужо такі парадак: хто больш паставіць гарэлкі, той старшыня. А хто-ж больш паставіць, як не багаты. Сяляне нашы таго не помняць, што гэту выпіўку старшыня пасля ў тры разы верне. У нас яшчэ і так бывае: выберуць старшыню, а назаўтра тыя самыя, што выбіралі яго, прыходзяць цалаваць яму рукі.

— Дзын-дзын-дзын! Дзын-дзын-дзын!—Земскі прыехаў.

Старшыня і пісар разам пабляднелі.

— Здраствуйце!

— Здравя жалаем, ваша сіяцельства!

Адзін выбарны здароўкаўся аддзельна. Усё ўжо сціхла, а ён, п'яны, як зямля, заікаецца, крычыць:

— Здраўя жжжалаю ввваша пппббблагароддзе!

— Ну, каго хочаце мець старшынёю?

— Таго, хто і быў!—крыкнулі разам.

— Ладна!—кажа земскі.

Я думаю, што «ладна»! Калі-б я быў на яго месцы, то і я сказаў-бы «ладна»...

Старшыня стаяў белы, як снег. Згорбіўся ў дзве пагібелі, як свінны татка.

Я бачыў яго да схода, такі бравы, як генерал які. Я пазіраў на яго ды думаў: няўжо-ж гэта той самы чалавек? Быць не можа! той быў роўны, а гэты—як абаранак. Той хадзіў па воласці, як сам цар, крычаў, аж шыбы бразгалі, а гэты сагнуўся, як жабрак, і маўчыць, як немка—толькі вачыма лыпае. Той быў тоўсты, а гэты на цэлы пуд худзейшы.

Як толькі пачуў ён моц сваю, павесялеў чалавек, выбраў мінуту, міргнуў пісару і язык высалапіў.

Земскі стаў нешта пісаць.

Здаецца ўсё зрабілася добра. І трэба-ж выскачыць якраз цяпер Піліпу, селяніну з чорнай барадой. Піліпа ў воласці не было, як выбіралі старшыню—выпіваў з сябрам.

Убег ён у воласць, як куля; стукнуў дзвярыма.

— Грамада! ужо выбралі? Апанаса Кветку? Каб вам дошкі сабралі! Каго вы выбралі? Яшчэ мала выпіў у вас крыві?

— Ціха!—кажуць. — Тут-жа земскі!

— А што мне ён? Але вы абармоты! Га-ааа? Ты старшынка? Сто рублёў прапіў! Каму трэба—падсунуў? Зноў кроў будзеш піць?...

Земскаму і старшыні хоць вазьмі засадзі туды вочы, дзе ніколі не сядзелі, а каб і сядзелі, то свету-б не бачылі.

А сход пазірае, як баран.

Беднага Піліпа пасадзілі ў халодную.

Гэтак пазалетась выбіралі старшыню каля Пінска.

1913 г.

Лепшы агітатар Мазырскай мэблевай фабрыкі „Профінтэрн" (Палеская вобласць) т. Агееў С. В. (злева) расказмачвае сям'і рабочага фабрыкі П. Ф. Трымайлава Палажэнне аб выбарах у абласныя, раённыя, гарадскія, сельскія і пасялковыя Саветы дэпутатаў працоўных БССР.

Фота Б. М. Хеніна (Фотохроніка БЕЛТА).

Зімні догляд за кветкамі

Некаторыя расліны, як фуксіі, гартэнзіі, ружы, цітрусовыя, прышчэпленыя на дзікім трохлістовым лімоне, і другія, на зіму скідаюць лісце. Для такіх раслін свет зімой не патрэбен, і іх трэба трымаць у прахладным, але не марозным месцы: у падвале, кладоўцы, у цёмным кутку паблізу дзвярэй, пад акном і т. д. У той-жа час іх трэба трымаць пасушэй, аднак не перасушваючы земляного кому, час ад часу паліваць вадой, але пазбягаць вялікай вільготнасці, плесені, загнойвання галінак і ў асаблівасці карэнняў. Зварочваць да жыцця такія расліны трэба, калі ў іх паспее почка, а ў цыбульных (амарылісы, цюльпаны, гіяцынты) пакажуцца кветкавыя стрэлкі, што бывае ў сярэдзіне лютага—пачатку сакавіка.

Кактусы з пачаткам зімы трэба паставіць у скрынках у немарознае, сухое, нават цёмнае месца. Паліваць іх за зіму прыдзецца разы два-тры, не больш.

Усе астатнія расліны на зіму расстаўляюцца папрастарней на вокны і каля вакон, так, каб яны лістамі не дакраналіся да халоднага шкла, не награваліся ад печак, каларыфераў і труб цэнтральнага ацяплення. Ставіць расліну на халодныя падаконнікі нельга. На падаконнікі трэба паставіць нізенькія лавачкі. Пад кожнай раслінай павінен быць паддон.

Расліны зімой патрэбна раніцой паліваць вадой хатняй тэмпературы, рэдка, але так, каб вада з'явілася на паддонне і прастаяла ў ім мінут 15—30, пасля гэтага ваду з паддоння зліць, паддон і гаршчок вышерці суха. Праз дзве гадзіны пасля паліўкі паверхню зямлі ў гаршку асцярожна ўзрыхліць вострай драўлянай палачкай.

У кватэрах з цэнтральным ацяпленнем, дзе паветра асабліва сухое, неабходна спырскваць расліны чыстай халоднай вадой, асабліва цітрусовыя (лімоны, апельсіны і другія).

Расліны трэба трымаць зімой у асаблівай чыстаце. Засохшыя лісты зараз-жа адрываць, а з такіх раслін, як герань, пеларгоніі, адразаць іх нажніцамі. Раз-два ў месяц добра абмываць усе расліны цеплаватай вадой з зялёным мылам (чайная лыжка на шклянку вады). Пасля гэтага расліны абмыць чыстай, цеплаватай вадой і спырснуць. Каб захаваць глебу ад забруднення пры абмыванні, расліну кладуць на бок ці на зямлю ў гаршку ўкутваюць анучай. Абмыўшы расліну, добра вымыць гаршчок цёплай вадой з мылам, паддон і палічкі з-пад раслін. Падстаўкі не дрэнна працерці анучай, злёгку змочанай карасінам, дэнатуратам ці другім дэзінфіцыруючым сродкам.

Пры такім доглядзе расліны рэдка хварэюць зімой і на іх не нападаюць паразіты. А калі яны ўсё-ж з'явяцца, то паражоныя расліны зараз-жа ізаліруюць ад здаровых і асабліва даглядаюць.

Работніцы, калгасніцы, сялянкі, жоны рабочых і служачых!

ЧЫТАЙЦЕ і РАСПАЎСЮДЖВАЙЦЕ СВОЙ ЖУРНАЛ

„Работніца і калгасніца Беларусі“

ВЫДАННЕ ЦК КП(б)Б

ЖУРНАЛ ВЫХОДЗІЦЬ ДВА РАЗЫ Ў МЕСЯЦ

да журнала бясплатна дадаецца выкладка-выкрайка.

Падпіска прымаецца ва ўсіх паштовых аддзяленнях і ў лістаносцаў

Адказны рэдактар Г. В. КАГАН.

Адрас рэдакцыі: г. Мінск, Савецкая, 40, 1 паверх.

Друкарня імя Сталіна. Зак. № 1166. Тыраж 13.000 экз. Уп. Галоўліта БССР № 659.

Здана ў друк. 25/XI—39 г. Падпісана да 4/XII—39 г. У нумары 2½ друк. арк., 120 140 друк. знак.

ЦАНА 20 КАП.

Да гатага нумару дадаецца ўкладка—выкрайка.